Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

*А. А. Грымаць,*
*Л. М. Цімашкова*

# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНЫХ УМЕННЯЎ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

Вучэбна-метадычны дапаможнік

ик - 1233

Бібліятэка
БДПУ імя М.Танка

Мінск 2000

УДК 378.14(075.8)
ББК 74.58я73
Г 917

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ імя М. Танка

*Рэцэнзент*: кандыдат педагагічных навук, дацэнт *А. А. Прохараў*

Грымаць А. А., Цімашкова Л. М.
Г 917 Фарміраванне камунікатыўных уменняў будучых настаўнікаў: Вучэб.-метад. дапам. — Мн.: БДПУ імя М. Танка, 2000. — 183 с.
ISBN 985-435-240-4

Выданне прысвечана актуальным праблемам фарміравання камунікатыўных уменняў будучых настаўнікаў. У працы прапанаваны прыёмы авалодвання майстэрствам зносін; выкладзены асноўныя метадычныя падыходы да фарміравання індывідуальнага стылю зносін у студэнтаў; распрацавана сістэма практыкаванняў па засваенні практычных навыкаў камунікатыўнага ўзаемадзеяння.

Рэкамендуецца студэнтам, аспірантам педагагічных вышэйшых навучальных устаноў і тым, каго цікавяць праблемы ўзаемаразумення, якія ўзнікаюць у працэсе зносін.

ББК 81.2Фр я73

ISBN 985-435-240-4
© А. А. Грымаць, Л. М. Цімашкова, 2000

# УВОДЗІНЫ

Міжасобасныя зносіны хвалююць у той ці іншай ступені ўсіх, і ад таго, наколькі паспяхова яны наладжаны, залежаць часам нашы поспехі і няўдачы. Жыццё чалавека самым непасрэдным чынам звязана са зносінамі, сфера якіх з'яўляецца тым фокусам, дзе спалучаюцца як вечныя, так і неадкладныя праблемы людзей.

Авалодваць майстэрствам зносін імкнуцца ўсе культурныя людзі. Хоць бы падсвядома, кожны чалавек марыць аб тым, каб заўсёды свабодна адчуваць сябе ў навакольным свеце, быць жаданым, выклікаць прыемнае ўражанне, прыносіць радасць і сабе, і людзям. Авалодаць майстэрствам жыць з людзьмі — справа настолькі ж складаная, наколькі і неабходная: тут важна не толькі веданне прынцыпаў і норм гуманістычных адносін, правільная ацэнка паводзін людзей і абставін, але і ўменне дзейнічаць адпаведна гэтым ведам і прынцыпам. Асабліва гэта неабходна настаўнікам, педагогіка навучае іх менавіта майстэрству зносін.

Гуманізацыя і дэмакратызацыя, якія сёння сталі прынцыпамі рэфармавання сярэдняй і вышэйшай школы, звязваюцца ў грамадскай свядомасці з гуманізацыяй вучэбнага працэсу: узбагачэннем адукацыі гуманітарным зместам, дыферэнцыяцыяй і індывідуалізацыяй навучання з ўлікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей вучняў, арганізацыяй вучэбнага працэсу, які дапускае перавагу формаў вучэбнай дзейнасці, арыентаваных на дыялог, на актыўныя зносіны.

Разважаючы пра гуманітарызацыю адукацыі, важна падкрэсліць неабходнасць маральнага ўзбагачэння асобы выкладчыка, што наўрад ці магчыма без авалодвання агульнай і прафесіянальнай (у тым ліку псіхолага-педагагічнай) культурай. Прафесіянальная культура выкладчыка сярэдняй і вышэйшай школы ў якасці сваіх структурных кампанентаў уключае ў сябе культуру самаўдасканалення, культуру пачуццяў, культуру мовы, якія рэалізуюцца ў культуры зносін, садзейнічаюць яе фарміраванню.

Адраджэнне гуманістычных прынцыпаў выхавання звязана з гуманізацыяй зносін людзей, а гэта магчыма пры ажыццяўленні трох умоў арганізацыі падрыхтоўкі будучых настаўнікаў: супрацоўніцтва са студэнтамі ( а не дыктат выкладчыка); дапамога студэнтам у іх імкненні прафесіянальна ўдасканальвацца і развівацца; разумная ступень свабоды выбару.

Пазнаць радасць зносін – імкненне любога чалавека, незалежна ад яго ўзросту або сацыяльнага статусу. Менавіта таму і падлетак, і дарослы,

спасцігаючы асновы майстэрства і тэхнікі зносін, набываюць навыкі, якія дазваляюць жыць асэнсавана і паўнацэнна.

Гэты дапаможнік рэкамендуецца студэнтам для самастойнай працы і тым, хто адчувае праблемы ва ўзаемаразуменні, хто імкнецца пераадолець цяжкасці, якія ўзнікаюць у працэсе зносін.

Рэалізацыя выхаваўчых магчымасцей зносін у многім вызначаецца асабістымі якасцямі настаўніка. Правільна знойдзены стыль педагагічных зносін, які адпавядае яго непаўторнай індывідуальнасці, садзейнічае вырашэнню комплексу задач: па-першае, педагагічнае ўздзеянне становіцца адэкватным асобе педагога, спрашчаецца сам працэс зносін з аўдыторыяй, ён становіцца прыемным, арганічным для самога педагога; па-другое, істотна палягчаецца працэдура наладжвання ўзаемаадносін з вучнямі; па-трэцяе, павышаецца эфектыўнасць усіх важнейшых функцый педагагічных зносін. Прыгэтым усё адбываецца на пазітыўным фоне добразычлівага стану педагога на ўсіх этапах зносін.

Методыка фарміравання індывідуальнага стылю зносін у студэнтаў уключае ў сябе некалькі этапаў:

1. Вывучэнне рэальных асаблівасцей індывідуальнага стылю зносін студэнтаў і ўсведамленне іх студэнтамі. Здзяйсняецца на аснове самааналізу, перакрыжаваных узаемных характарыстык студэнтаў, назіранняў выкладчыкаў. Студэнты з гэтай мэтай пішуць сачыненне на тэму "Які я ў зносінах з іншымі людзьмі", а таксама ўзаемахарактарыстыкі аналагічнай тэматыкі і г.д.

2. Выяўленне недахопаў у асабістых зносінах і праца па іх ліквідацыі: пераадоленне сарамлівасці, скаванасці, негатыўных напластаванняў у стылі адносін.

3. Распрацоўка заданняў адносна эмацыянальна-спрыяльнага для педагога стылю зносін і іх суаднесенасць з данымі саманазірання.

4. Авалодванню цэласным актам педагагічных зносін у адпаведнасці з уласным стылем паводзін і ўдакладненне апошняга на спецыяльных занятках.

5. Ажыццяўленне рэальная педагагічнай дзейнасці — зносіны з дзецьмі на аснове індывідуальнага стылю — і замацаванне апошняга ў працэсе педагагічнай практыкі і стажыроўкі.

Пачынаючаму настаўніку неабходна сістэматычна працаваць над фарміраваннем індывідуальнага стылю зносін.

У арганізацыі выхаваўчага працэсу важную ролю выконваюць і аспекты педагагічных зносін, звязаныя с непасрэдным узаемадзеяннем педагога і дзяцей. Тут можна выдзеліць некалькі стадый. Першая стадыя — гэта

арыентаванне выхавальніка ў сітуацыі выхаваўчага працэсу, які ўключае ў сябе аднаўленне ў педагагічнай памяці папярэдніх асаблівасцей зносін з класам, канстатацыю сітуацыі зносін, яе аператыўную суадноснасць з мінулай сітуацыяй узаемадзеяння і са спланаванай загадзя мадэллю ўзаемадзеяння, удакладненне стылю ўласных зносін. Патрэбна мець на ўвазе, што гэтая стадыя працякае вельмі аператыўна, і менавіта тут павінна нарадзіцца патрэбнае слова, інтанацыя, паводзіны.

Для прадуктыўнага працэсу педагагічных зносін недастаткова арыентацыі ў яго ўмовах. Пачатак узаемадзеяння з дзецьмі звязаны с вырашэннем яшчэ адной важнай камунікатыўнай задачы — прыцягненнем да сябе ўвагі аб'екта зносін (другая стадыя).

Што значыць прыцягнуць да сябе ўвагу аб'екта зносін? Гэта значыць падвесці сацыяльна-псіхалагічную аснову пад плануемае ўзаемадзеянне, пад запланаваныя метады, арганізацыйныя формы навучання, прыцягнуць агульную ўвагу вучняў, неабходную для правядзення ўрока.

Нярэдка маладыя настаўнікі лічаць, што вучні і так павінны засяродзіць сваю ўвагу на педагогу, і не вырашаюць гэтую важную камунікатыўную задачу мэтанакіравана. Што можна парэкамендаваць пачынаючаму настаўніку? Вопыт і даследаванні дазваляюць вылучыць некалькі варыянтаў прыцягнення да сябе ўвагі класа. Самы распаўсюджаны з іх — маўленчы варыянт (вербальны зварот да класа). Сярод іншых варыянтаў — паўза (з актыўнымі ўнутранымі зносінамі — патрабаваннем увагі), рухава-знакавы варыянт (праход па класу, развешванне табліц, наглядных дапаможнікаў, запіс на дошцы і да т.п.) і, нарэшце, змешаны варыянт, які ўключае ў сябе элементы ўсіх астатніх.

Галоўнае тут — знайсці такі псіхалагічны эпіцэнтр-сігнал, які б праз стварэнне ўстаноўкі мабілізоўваў вучняў, схіляў іх да ўзаемадзеяння з педагогам. Дакладны спосаб прыцягнення ўвагі перад пачаткам зносін, як правіла, робіць мабілізуючы ўплыў на клас, больш дзейсны, чым проста павышэнне голасу. Адначасова значнымі магчымасцямі ў гэтым пачатковым кіраванні зносінамі валодае тэкст, эмацыйная насычанасць якога ў многім абумоўлівае эфектыўнасць выхаваўчага ўплыву.

Дакладнасць руху і жэсту ў сістэме педагагічных зносін надзвычай важныя, тым больш калі яны выступаюць як семантычныя рухі, што замяняюць словы, напрыклад, "спыніся", "ідзі", "так", "не", "прашу вас", "цішэй" ды інш. Часам гэтыя рухі ўзаемадзейнічаюць са словамі, часам цалкам замяняюць іх. Але ў любым выпадку, калі ў штодзённым жыцці такія семантычныя рухі ўдасканальваюцца ў практыцы чалавечых зносін самі па сабе, то ў сістэме

прафесійных зносін яны павінны быць асэнсаванымі і максімальна кіруемымі, перадаваць педагагічныя перажыванні, што патрабуе высокай пластычнасці і выразнасці цела.

Важную ролю ў працэссе арганізацыі педагагічных зносін выконвае трэцяя стадыя, якую К.С.Станіслаўскі называе "зондирование души объекта".

Па сутнасці, гэта своеасаблівы пошукавы этап любога акта камунікацыі, паколькі перад тым як мэтанакіравана дзейнічаць, напрыклад, у накіраванні выкладу новага матэрыялу, педагог, лектар ды інш. як быццам "абмацваюць" позіркам клас, аўдыторыю, унутрана падрыхтоўваючы іх да будучых зносін, да тлумачэння новага матэрыялу. Дадзены этап мае папярэдні характар — педагог удакладняе ўяўленні аб умовах зносін і камунікатыўных задачах, якія склаліся на мінулых стадыях, імкнецца зразумець узровень падрыхтаванасці аўдыторыі да неадкладнага пачатку прадуктыўных зносін, выбраць аптымальны момант для пачатку зносін на аснове дакладнага ўяўлення абставінаў.

У практыцы педагагічнай дзейнасці гэты этап нярэдка апускаецца, што адбіваецца на эфектыўнасці ўсяго наступнага працэсу зносін. Можна назваць дадзены этап пераходным ад падрыхтоўчага цыкла зносін, у які можна аб'яднаць першую і другую стадыі, да цыкла ўвасаблення, дзейсных зносін, які ўключае ў сябе чацвёртую і пятую стадыі. Менавіта на трэцяй стадыі адбываецца хуткая выніковая карэкціроўка і канчатковае ўдакладненне раней прадуманых прыёмаў зносін у прыстасаванні да стану аўдыторыі сённяшнім магчыма[illegible]цям успрымання матэрыялу вучнямі. Педагог і дзеці ператвараюцца ў суб'ектаў зносін. На гэтай стадыі, як, дарэчы, і на іншых, важна правільнае ўспрыманне асобы аб'екта будучых зносін, у ліку і на аснове толькі ўспрымання найдрабнейшых рухаў, мікрамімікі.

Практыка выхаваўчай працы патрабуе ад асоб, якія непасрэдна арганізуюць выхаваўчы працэс, высокай сенсорнай культуры, што праяўляецца, у прыватнасці, у моцна развітым уменні адрозніваць і правільна, дакладна тлумачыць нюансы ў макра- і мікраэкспрэсіі выхаванцаў. Ствараецца своеасаблівы эффект камунікатыўнага люстэрка, у якім педагог адрознівае такія эмацыянальныя залежнасці, якія дапамагаюць яму арыентавацца як у эмацыянальным, так і навучальна-выхаваўчым мікраклімаце ўрока.

Практыка паказвае, што дакладная арыентацыя ў эмацыянальным стане кожнага вучня з'яўляецца важнейшай педагагічнай умовай эфектыўнасці выхавання.

Нярэдка ў працэсе шматгадовых зносін з класам настаўнік прывыкае да стэрэатыпу зносін і міжволі выкарыстоўвае яго з года ў год. Неабходна

памятаць, што дзеці мяняюцца, растуць, таму і сістэма іх патрабаванняў да арганізацыі ўзаемаадносін мяняецца. Вось чаму кожны раз трэба старанна карэкціраваць зносіны з класам, улічваць узроставыя змяненні. Змяненні ў адносінах дзяцей да настаўніка павінны пастаянна аналізавацца, паколькі менавіта яны ў многім вызначаюць ступень прыняцця асобай нашага выхаваўчага уплыву.

Чацвёртая стадыя педагагічных зносін – вербальнае ўзаемадзеянне, якое абавязкова павінна спалучацца з сістэмай "вобразнага бачання" таго, пра што ідзе гаворка. Неабходна вырашыць важную ў педагагічных адносінах задачу: прымусіць аб'ект не толькі пачуць, зразумець, але і ўбачыць унутраным зрокам, што і як уяўляе тое, што перадаецца, сам выхавальнік. Прапанова педагагічнага патрабавання, арганізацыя гутаркі, размова, элементарны зварот да вучняў павінны быць дакладнымі, эмацыянальнымі.

Важна, каб слова выхавальніка было актыўным, уздзейнічала на пачуцці і свядомасць, стымулявала мысленне, уяўленне, змяняла матывацыйна-патрабавальную сферу дзяцей. Добра сказанае дзецям дзелавое, моцнае слова мае вялікае значэнне, і, магчыма, у нас так шмат яшчэ памылак у аргаізацыйных формах, таму што мы і гаварыць яшчэ часта з дзецьмі па-сапраўднаму не ўмеем. А трэба ўмець сказать так, каб яны ў словах настаўніка адчулі яго волю, культуру, асобу. Гэтаму трэба вучыцца.

Важную ролю ў ходзе педагагічных зносін выконвае своеасаблівае прыстасаванне педагога ў зносінах, пад якім разумееецца сістэма прыёмаў псіхалагічных, мімічных, пантамімічных, маўленчых, рухавых і да т.п., што выбіраецца для арганізацыі адэкватнай задачы і адпавядае асаблівасцям педагагічнай сітуацыі структуры зносін, а значыць, садзейнічае найбольш эффектыўнаму выхаваўчаму ўздзеянню.

У арганізацыі выхаваўчага ўздзеяння трэба ўлічваць узаемасувязь маўлення і мімікі, невербальных рухаў, жэстаў ды інш. Кожны гэты элемент педагагічных зносін дапаўняе метады выхавання неабходным псіхалагічным насычэннем. Такой тэхнікай непарыўных педагагічных зносін, у тым ліку і мімічнымі сродкамі, валодаюць майстры педагагічнай працы, у якіх адзін рух броваў, пакачванне галавой, змяненне прасторавых суадносін у зносінах з дзецьмі (набліжэнне, аддаленне і да т.п.), выражэнне вачэй набываюць дзейсны выхаваўчы ўплыў.

Пятая стадыя педагагічнага ўзаемадзеяння – адваротная сувязь, якая адбываецца як у плане змястоўным, так і эмацыянальным. Адваротная сувязь – абавязковы кампанент любога працэсу зносін, а ў педагагічнай дзейнасці яна

носіць прынцыповы характар. Пры ўмове ўстойлівага дзеяння яна дапамагае вызначыць узровень засваення вучэбнага матэрыялу, адчуць агульную атмасферу ўрока, яго псіхалагічны клімат, настрой дзяцей, іх падрыхтаванасць да ўзаемадзеяння ды інш. Дастаткова часам толькі паглядзець на дзяцей, каб уразумець, ці гатовы яны да ўспрымання новага матэрыялу, ці могуць неадкладна пачаць працаваць, цікава ім або не ды інш. Адваротная сувязь дапамагае па-сапраўднаму арганізаваць прадуктыўнае ўзаемадзеянне з вучнямі. Названыя стадыі непасрэдных зносін цыклічна паўтараюцца ў кожным адносна самастойным акце педагагічнага ўзаемадзеяння. Іх трэба мець на ўвазе, арганізуючы выхаваўчы працэс.

У сувязі са значнасцю зносін у арганізацыі выхаваўчага ўплыву асаблівыя патрабаванні прад'яўляюцца да культуры педагагічных зносін, да тактоўнасці выхавальніка, якая выступае ў яго як прафесійна-асабістая якасць. Выхавальнік павінен мець зносіны з людзьмі ў сітуацыі калектыўнага, групавога, індывідуальнага ўзаемадзеяння, мэтанакіравана арганізоўваць зносіны са школьнікамі і кіраваць імі. Можна выдзлучыць наступныя параметры прафесійна-педагагічнай тактоўнасці, на якія належыць арыентавацца пачынаючаму настаўніку: наяўнасць устойлівай патрэбнасці ў сістэматычных зносінах з дзецьмі ў самых разнастайных сферах, праяўленне эмацыянальнага дабрабыту на ўсіх этапах зносін, камунікатыўных якасцей, уменняў, навыкаў.

Педагогу неабходна сістэматычна працаваць над фарміраваннем у сябе здольнасцей да зносін як прафесійна-асабістай якасці. Можна рэкамендаваць наступную праграму прафесійна-асабістага камунікатыўнага самавыхавання:

1. Ажыццяўленне прафесійнага самапазнання (выяўленне ўласных камунікатыўных якасцей, станоўчых і слабых бакоў у зносінах) і распрацоўка на гэтай аснове праграмы камунікатыўнага самавыхавання. Тут мэтазгодна ацэньваць уласную асобу ў наступных напрамках: аналіз вопыту адчуванняў ад зносін з дзецьмі, аналіз мінулага вопыту зносін з дзецьмі, аналіз цяперашняга ўзроўню зносін з дзецьмі, аналіз сваіх ідэальных уяўленняў пра зносіны, аналіз уяўленняў пра тое, як ацэньваюць вашы магчымасці ў зносінах іншых.

2. Праца на аснове спецыялізаванага трэнінгу па развіцці ў сабе асноўных характарыстык здольнасці да зносін.

3. Разнастайная грамадская праца з дзецьмі і людзьмі, у якой набываецца вопыт камунікатыўнай дзейнасці (лекцыі, гутаркі і да т.п.).



4. Стварэнне сістэмы сітуацый, якія фарміруюць вопыт пераадолення негатыўных настрояў у зносінах і садзейнічаюць развіццю камунікатыўнасці.

Апора на прапанаваную сістэму актывізуе фарміраванне камунікатыўнасці як прафесійна-асабістай якасці педагога.

# ГЛАВА 1. АСАБЛІВАСЦІ ПЕДАГАГІЧНЫХ ЗНОСІН

## 1.1.Асноўныя характарыстыкі зносін

Чалавек – істота грамадская. З моманту свайго нараджэння ён трапляе ў сфарміраваную сістэму чалавечых зносін і ўступае ва ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі. Узаемадзеянне з тымі, хто акружае – гэта аб'ектыўны працэс, які ўзнікае дзякуючы асабістай і грамадскай неабходнасці. Жадае чалавек таго ці не жадае, задумваецца аб гэтым ці не, але ён заўсёды ажыццяўляе міжасобовае ўзаемадзеянне, найперш за ўсё з тымі, хто яго акружае: з бацькамі, педагогамі, сябрамі, са знаёмымі і нават незнаёмымі людзьмі. Гэта міжасабовае ўзаемадзеянне, якое адбываецца ў выглядзе абмену словамі, мімікай, дзеяннямі, уяўляе сабой рэальна існуючую сувязь, узаемную залежнасць паміж суб'ектамі. У структуры гэтага ўзаемадзеяння, якое мае багаты псіхалагічны змест, можна вылучыць тры асноўныя кампаненты: канатыўны, гнастычны, афектыўны.

Канатыўны кампанент уключае ў сябе тое, што людзі могуць назіраць у працэсе ўзаемадзеяння: міміку, жэстыкуляцыю, дзеянні і ўчынкі, пантаміміку адзін аднаго і інш.

Гнастычны кампанент звязаны з актыўнасцю асобы па засваенні і перапрацоўцы інфармацыі, па назапашванні новых ведаў.

Афектыўны кампанент звязаны са станам асобы, якая прымае ўдзел ва ўзаемадзеянні.

Для апісання міжасабовага ўзаемадзеяння выкарыстоўваюцца такія паняцці, як узаемныя дзеянні, узаемаўплыў, узаемаразуменне, узаемаадносіны, зносіны.

Узаемныя дзеянні могуць адбывацца ў форме садзеяння (аказання ўзаемадапамогі), бяздзейнасці (неўдзелу ў дзеяннях іншага чалавека), процідзеяння (ажыццяўлення дзеянняў, якія перашкаджаюць інтарэсам і дзейнасці партнёра па ўзаемадзеянні). Узаемаўплыў дапускае змену ўсведамлення, паводзін, пачуццяў і матываў партнёра. Узаемаадносіны ўяўляюць сабой сукупнасць міжасабовых ацэнак, на аснове якіх у партнёраў узнікае гатоўнасць да пэўнага тыпу дзеянняў і перажыванняў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Леонтьев А.А.Педагогическое общение. – М.: Знание, 1979. – 47 с.

2. Добрович А.Б. Воспитателю о психологии и психогигиене общения.– М.: Просвещение, 1987.– С. 88.

3.Умеете ли вы общаться? Кн. для уч-ся И.М.Горелов, У.Ф.Житников., М.В.Зюзько., Л.А.Шкатова. – М.: Просвещение, 1991. – 142 с.

4. Берн Э. Трансактный анализ и психотерапия. СПб: Братство, 1994. – 224 с.

5. Бодалёв А.А. Личность и общение.– М.: МПА, 1995. – 326 с.

6. Коломинский Я.Л. Психология взаимоотношений в малых группах (Общие и возрастные особенности): Учебное пособие для студентов педагогических специальностей вузов. – Минск: НТООО Театра-Сервис, 2000.– 431с.

7. Леонтьев А.А. Психология общения. – М.: Смысл, 1997. – 364 с.

8. Мудрик А.В. Общение школьников. – М.: Знание, 1987. – 76 с.

9. Кан-Калик В.А. Основы профессионально-педагогического общения. Грозный, Чечено-Ингушский ун-т им. Л.Н.Толстого, 1979. – 138 с.

10. Кан-Калик В.А. Учителю о педагогическом общении. – М.: Просвещение, 1987.– 190 с.

11. Основы педагогического мастерства / Под ред. И.А. Зязюна – М.: Просвещение, 1989.– 301 с.

12. Ломов Б.Ф.Общение как проблема общей психологии / Методологические проблемы социальной психологии. – М.: Наука, 1975, – С. 124-125.

13. Шостром Э. Анти-Карнеги, или человек-манипулятор. – Минск: Полифакт, 1992.– 128 с.

14. Чехов А.П. Об ораторском искусстве . – М., 1980. – С. 76.

15. Пушкін А.С. Выбраныя творы ў 2-х т.– Мінск: Маст. літ,1993. – Т.2.– С. 12-15.

16. Тынянов Ю.Н. Пушкин. – Минск: Наука и техника, 1981.– С.280.

17. Радищев А.М. Полное собрание сочинений / Под ред. Н.К.Пиксанова. – М. – Л.: Ак.Наук СССР, 1952. – С.130-131.

18. Фрейд З. Введение в психоанализ. Лекции.– М.: Наука, 1989. – С.8.

19. Вердяев М.И. Судьба России. – М.: Сов. писатель, 1990. – С.203.

20. Шкловский В.Б. Повести о прозе. Соч в 2-х т. – М.: Худ. лит., 1966.– С.3.

21. Войскунский А.Е. Я говорю, мы говорим. Очерки о человеческом общении. – М.: Знание, 1990.– 238 с.

22. Античные риторики/Под ред.А.А.Тахо-Годи.-М.:МГУ,1978.-352с.

23. Лихачёв Д.С. Земля родная. – М.: Просвещение, 1983.– С. 31-32.

24. Карнеги Д. Как перестать беспокоиться и начать жить.– М.: Прогресс, 1990.– С. 93.

25. Соловейчик С.Л. Педагогика для всех . – М.: Дет. лит., 1989. – С.307.

26. Тургенев И.С. Рудин. Повести и рассказы. – М.: Правда, 1984.– 496 с.

27. Грыгорьев Г.Н. Моўны слых и моўны голас. – Мінск: " Вышейшая школа", 1976. – С.10.

28. Станиславский К.С. Собр. Соч. в 9-ти т. – Т.3. – М.: Искусство, 1994.– С.63.

29. Гольдин В.И. Речь и этикет. – М.: Просвещение, 1983. – С.55.

30. Верещагин Е.М., КостомаровВ.Г. Язык и культура. Лингвострановедение и преподавание русского языка как иностранного: Метод. рук-во. – М.: Рус. язык, 1983. – 269 с.

31. Князьков А.А. Техника речи и постановка голоса: Метод. разработки. – М.: Прометей, 1990. – С.5- 6.

32. Техника речи учителя: Метод. материалы к экспериментальной программе "Педагогическая техника учителя". – М.: АПН СССР НИИ общей педагогики / Сост. В.П. Лихачёв, Е.А.Ларионова. – М., 1986. – С.16-17.

33. Манфрэд А.З. Три портрета эпохи Великой французской революции. (О Руссо, Мирабо, Робеспьере). – М.: Мысль, 1989. – 430 с.

34. Данин Д.С. Человек вертикали. Повествование о Нильсе Боре. Избранное. – М.: Сов. писатель, 1984. – С.274-277.

35. Психология: Словарь / Под общ. ред. А.В.Петровского, М.Г.Ярошевского. – М.: Политиздат, 1990. – 494 с.

36. Головин Б.Н., Кобрин Р.Б. Лингвистические основы учения о терминах.– М.: Выс. школа, 1987.– 320 с.

37. Гамезо М.В., Домашенко И.А. Атлас по психологии.– М.: Просвещение, 1986.– С.107.

38. Русский язык. Энциклопедия / Под ред. Н.А.Арутюновой. – М., 1979. – С.255.

39. Короленко В.Г.История моего современника. – М.: Худ. лит., 1965. – С. 208-210.

40. Ножин Е.А. Мастерство устного выступления. – М.: Политиздат, 1989. – 254 с.

41. Рождественский Ю.В. Актуальные проблемы советской риторики. – М.: МГУ, 1984. – 63 с.

42. Словарь-справочник по методике русского языка / Под ред. Н.Р.Львова. – М.: Просвещение, 1988. – С.175.

43. Дудинцев В.Д. Белые одежды. – М.: Рус. язык, 1988. – С.341-344.

44. Паустовский К.Г. Повести о жизни : в 2 т. – М.: Сов.Россия, 1966.– Т.1.– С.645-646.

45. Русский язык. Энциклопедия/ Под ред. Ф.Н. Филина. – М., 1979. – С. 19.

46. Большая советская энциклопедия в 30 т. / Под ред. Л.М.Прохорова. – М.: Сов. Энциклопедия, 1973. – Т. 13. – С. 597.

47. Виноградов В.В. Русский язык ( Грамматическое учение о слове): Учебное пособие. – М.: Выс. школа, 1986. – 639 с.

48. Ожегов С.И. Лексикология. Лексикография. Культура речи. – М.: Высшая школа,1974. – 552.

49. Розенталь Д.Э., Таленкова М.А. Словарь-справочник лингвистических терминов. – М.: Просвещение, 1976. – С. 159.

50. Язык и личность / Под ред. Д.И. Шмелёва. – М.: Наука, 1989.– С.3.

51. Ключевский В.О. Литературные портреты. – М.: Современник, 1991. – С 214-215.

52. Ключевский В.О.: Сб. материалов. Вып. № 1– Пенза, 1995, – С. 29-45.

53. Ключевский В.О. Афоризмы. Исторические портреты и этюды. Дневники. – М.: Мысль, 1993. – С.8.

54. Елканов С.Б. Профессиональное самовоспитание учителя. – М.: Просвещение, 1986. – 143 с.

55. Кривонос И.Ф., Тарасевич Н.Н. Вопросы профессионально-педагогической подготовки будущего учителя. – М.: Выс. школа, 1985.– С.20.

56. Дридзе Т.М. Язык и социальная психология. – М.: Выс.школа, 1980. – С.6-7.

57. Стернин И.А. Нормы человеческого общения /Тэзисы докладов межвуз. науч. конф. – Горький, 1990. – С.230-231.

58. Гранин Д. Иду на грозу. – Л.; Лениздат, 1967. – С.149-151.

59. Липилин В.Г. Алексей Николаевич Крылов. – М.: Мол. гвардия, 1983. – С.204-213.

60. Головин Б.Н. Основы культуры речи. – М.: Выс.школа, 1988. – С. 287-288.

61. Когтев Н.И. На трибуне учёные. – М.: Знание, 1976. – С.55.

62. Карнеги Д. Как выработать уверенность в себе и воздействовать на людей, выступая публично. – М.: Прогресс, 1989. – С.48.

63. Гранин Д. Искатели. – Л.: Лениздат, 1977. – С.336-341.
64. Гурович С.С., Погорелко В.Ф., Герман Н.А. Основы риторики. – Киев, Высш. школа, 1988. – С. 63.
65. Шипель В. Социально-психологические проблемы воспитания. – М.: 1987. – С.198-216.
66. Цицерон. Три трактата об ораторском искусстве. – М.: Наука, 1972. – 162 с.
67. Кирпичник А.Г., Ижицкий В.П. Летние объединения старшеклассников. – М.: Знание, 1984. – С.80.
68. Атватер И. Я вас слушаю. – М.: Экономика, 1984. – 111 с.
69. Русский язык.Энциклопедия / Под ред. Ф.Н. Филина. – М.: Русский язык, 1979. – 290 с.
70. Бек А.А. Новое назначение. – М.: Из-во"Кн. палата", 1987. – С.149-152.
71. Кошанский Н.Ф. О ораторском искусстве. – М.: Знание, 1980, – С.93.
72. Куваев О.М. Территория . – М.: Современник, 1975.– С. 149-151.
73. Карнеги Д. Как завоёвывыть друзей и оказывать влияние на людей. – М.: Прогресс, 1992, – 190 с.
74. Смолка К. Правила хорошего тона. – М.: Прогресс, 1980. – 271 с.
75. Камычек Я. Вежливость на каждый день. – М.: Знание, 1988. – 128 с.
76. Юнг К. Психологические типы. – СПб: Ювента, М.: Прогресс-Универс, 1995. – 716 с.
77. Павлов И.П. Мозг и психика: Избр. Психол. труды. – М.: Ин-т практ. психологии. 1996, – 317 с.
78. Стокшус К. Этикет в развитии общества. – М.: Политиздат, 1988. – С.240-241.
79. Матвеев В.М., Панов А.Н. В мире вежливости. – М.: Мол. гвардия, 1983. – 190 с.
80. Хорват Ф., Орлик Ю. Вежливость накаждый день. – М.: Мол. гвардия, 1981. – С.17.
81. Грановская Р.М. Элементы практической психологии. – Л.: ЛГУ, 1988. – С. 444.
82. Лингвистический энциклопедический словарь. – М., 1990. – 356 с.
83. Словарь иностранных слов. – М.: Рус. Язык, 1981. – 662 с.

## ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ....................................................3

ГЛАВА 1.Асаблівасці педагагічных зносін....................9

1.1. Асноўныя характарыстыкі зносін.........................9

1.2. Педагагічныя зносіны..................................16

ГЛАВА 2. Стан партнёраў па зносінах........................20

2.1. Бацька................................................20

2.2. Дзіця.................................................23

2.3.Дарослы................................................25

2.4.Хырактэрныя прыкметы станаў............................27

ГЛАВА 3. Трансакцыйны аналіз у педагогіцы. Віды трансакцый..32

3.1 Узаемадапаўняльныя трансакцыі..........................32

3.1.1.Прыбудова зверху.....................................32

3.1.2.Прыбудова знізу......................................34

3.1.3.Прыбудова побач......................................34

3.2.Трансакцыі без узаемнага дапаўнення....................35

3.2.1.Вуглавые трансацыі...................................35

3.2.2.Паралельныя трансакцыі без узаемнага дапаўнення......36

3.2.3.Перакрыжаваныя трансакцыі............................36

3.3.Схаваныя трансакцыі....................................37

ГЛАВА 4. Узроўні зносін....................................41

4.1. Характарыстыка ўзроўняў зносін........................41

4.2. Прымітыўны ўзровень...................................42

4.3. Маніпулятыўны ўзровень................................43

4.4. Стандартызаваны ўзровень..............................44

4.5. Канвенцыянальны ўзровень..............................46

4.6. Гульнявы ўзровень.....................................47

4.7. Дзелавы ўзровень......................................48

4.8. Духоўны ўзровень......................................48

ЗАКЛЮЧЭННЕ.................................................51

ДАДАТАК 1..................................................52

ДАДАТАК 2.................................................127

ДАДАТАК 3.................................................167

ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК....................................175

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ..............................179